ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
24
МАЯ
ЧАЦВЕР
№ 18 (1431)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### ТЫДЗЕНЬ

савецка-балгарскай дружбы прайшоў у БДУ імя У. І. Леніна. Ён закончыўся вечарам, прысвечаным 40-годдзю сацыялістычнай рэвалюцыі ў Балгарыі. На ім былі ўзнагароджаны пераможцы конкурсу-віктарыны «Сацыялістычнай Балгарыі — 40 гадоў», арганізаваным камітэтам ЛКСМБ, аддзяленнем Таварыства савецка-балгарскай дружбы і балгарскім зямляцтвам.

Першы прыз уручаны камуністычнаму студэнцкаму будаўнічаму атраду імя Г. Дзімітрава. Пераможцамі віктарыны сталі таксама студэнты 3 курса гістарычнага факультэта Юрый Катаеў, Аляксандр Самуйліч і Аляксандр Снытко і студэнтка 1 курса гістфака Галіна Несцярэнка.

А. ХВЯЖЭНКА,
студэнтка гістарычнага факультэта.

### ПРЭЗІДЫУМ ПРАФКОМА

супрацоўнікаў на чарговым пасяджэнні абмеркаваў работу прафсаюзных бюро ФПМ і біялагічнага факультэта па рэалізацыі мерапрыемстваў, прысвечаных 40-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Была таксама заслухана справаздача аб рабоце спартыўна-масавай камісіі прафкома.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### НА ПЕРШЫНСТВЕ

ВНУ рэспублікі па баскетболу спартсмены нашага універсітэта занялі трэцяе месца пасля каманд ІФК і БПІ. Упартым быў фінал у дзяўчат, дзе нашы баскетбалісткі на апошніх мінутах матча ўступілі камандзе ІФК чатыры ачкі.

І. УЛАДЗІМІРАЎ.

### НА СУД ГЛЕДАЧОЎ

рэспубліканскай творчай секцыі «Маладыя маладым», якая дзейнічае пры Доме мастацтваў, народны тэатр БДУ імя У. І. Леніна вынес спектакль «Бяда ад пяшчотнага сэрца» па п'есе В. Салагуба. Прысутныя горача апладзіравалі самадзейным артыстам.

Э. АНІСЕНКА,
мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.

У СТУДЭНЦКІХ НАВУКОВЫХ ГУРТКАХ

**На маё пытанне: «Што прывяло вас на фізфак?» — першакурсніцы факультэта Ілона Данільчанка і Ніна Мальцава адказалі таксама пытаннем:**

**— А вы ведаеце, што ў саставу золата ўваходзіць пяць элементаў?**

## АД ЗАХАПЛЕННЯ — ДА ПРЫЗВАННЯ

Прызнацца, я гэтага не ведаў, як не ведалі і яны, пакуль не прыйшлі ў школу юных фізікаў пры БДУ імя У. І. Леніна. Было гэта ў дзевятым класе. Цяпер жа яны, студэнткі універсітэта, ведаюць значна больш і пра золата, і пра шматлікія іншыя з'явы. Цікавасць перарасла ў захапленне — у напружаную навуковую працу. Дзяўчаты — члены навуковага гуртка пры кафедры фізікі цвёрдага цела фізічнага факультэта.

**— Ці задаволены вы ўдзелам у навуковай рабоце? — спытаў я ў студэнтак.**

— Безумоўна,— у адзін голас адказалі дзяўчаты.— Яна дысцыплінуе, прымушае больш адказна адносіцца да абранай спецыяльнасці, урэшце гэта проста цікава.

Іх кіраўнік, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры фізікі цвёрдага цела Віктар Міхайлавіч Анішчык, які зараз узначальвае НДР студэнтаў малодшых курсаў, членаў студэнцкага навуковага таварыства, адзначае:

— Гэта мае найбольш актыўныя студэнткі. Яны заўсёды наведваюць гурток, цікавяцца рознымі фізічнымі з'явамі, самастойна шукаюць вырашэння хвалюючых пытанняў.

**— Віктар Міхайлавіч, ці ёсць сувязь у навуковай рабоце паміж старшакурснікамі і студэнтамі малодшых курсаў?**

— Абавязкова. Сувязь самая непасрэдная. Студэнты самі распрацоўваюць тэмы навуковых работ, збіраюць складаныя схемы. Старэйшым студэнтам, больш вопытным, ёсць чым падзяліцца са сваімі малодшымі таварышамі. Ды і маральная падтрымка старшакурснікаў адыгрывае важную ролю ў рабоце гурткоўцаў.

**— Ці шмат студэнтаў удзельнічае ў навукова-даследчай рабоце, якія метады заахвочвання выкарыстоўваюцца?**

— На факультэце дзевяць кафедраў,— расказвае студэнт 5 курса Аляксандр Малярэвіч, які на працягу некалькіх гадоў быў адказным за навукова-даследчую работу студэнтаў.— На кожнай з іх існуе навуковы гурток, у які ўваходзяць і студэнты малодшых курсаў. Што датычыць метадаў заахвочвання, то, самае галоўнае,— жаданне самога студэнта плюс лекцыі, якія раскрываюць навуковыя высновы будучай прафесіі.

**— Ці абмяжоўваецца дзейнасць СНТ толькі сценамі факультэта?**

—. Зразумела, не. Пастаянна арганізуюцца экскурсіі ў інстытуты пры АН БССР. Гэта дапамагае выбраць спецыялізацыю, расшырае кругагляд членаў СНТ.

Хочацца дадаць: поспехаў не будзе без напружанай працы, без жадання. І калі яно ёсць у студэнта, то яго патрэбна ўсімі сіламі падтрымліваць, ісці насустрач, дапамагаць, выхоўваць сапраўднага спецыяліста, майстра сваёй справы.

Г. ЛЯХАЎ,
студэнт факультэта журналістыкі.

ФОТА ТЫДНЯ



— Ну, як там!
— Зноў «чацвёрка»...
— Ай...— Андрэй Сакалоўскі, першакурснік з хімфака, яшчэ раз уважліва ўглядзеўся ў далячынь трамвайных рэльсаў.

Восем гадзін раніцы... На прыпынку каля стадыёна «Дынама» хвалююцца, перагаворваюцца паміж сабой, чакаючы наступнага трамвая, фізікі, матэматыкі, географы, журналісты. Вось-вось празвініць званок на першую лекцыю, і студэнты ўсё нецярплівей пазіраюць за паварот.

— Ідзе, ідзе! «Сямёрка».

Падыходзіць да прыпынку трамвай, адыходзяць апошнія дні семестра... Сесія ўпэўнена ўступае ў свае правы...

С. ПЛЫТКЕВІЧ.
Фота аўтара.

ЗЛЁТ ФІЛОЛАГАЎ

## СВЯТА Ў ВЯЗЫНЦЫ

У МІНУЛУЮ суботу ў Вязынцы, на радзіме Янкі Купалы, адбыўся чарговы, сёмы злёт студэнтаў-філолагаў, у якім прынялі ўдзел 13 студэнцкіх атрадаў. У асноўным гэта былі выхаванцы філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна, але былі і прадстаўнікі Калінінградскага універсітэта, а таксама ганаровыя госці. З раніцы адчувалася незвычайнае ажыўленне на ціхіх алеях купалаўскіх мясцін. Калыхаліся на ветры чырвоныя сцягі, ужо ўстаноўлены палаткі ўдзельнікаў — усё было гатова да адкрыцця злёту. Дарэчы, сюды запрашаліся ўсе жадаючыя. Хто не быў тут ні разу, можа прыехаць на наступны год. І я ўпэўнены, што не пашкадуеце. Вы адчуеце атмасферу сапраўднага свята. І можна сказаць без перабольшання, што свята гэта сапраўды атрымалася.

Добрай традыцыяй стала правядзенне купалаўскіх дзён напярэдадні святкавання гадавіны вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў. Сёння цяжка пераацаніць значэнне вершаў Янкі Купалы, напісаных у гады вайны, якія з'яўляліся страсным заклікам да барацьбы, былі пранікнуты нянавісцю да захопнікаў і любоўю да сваёй Радзімы, да свайго народа, сталі крыніцай веры ў хуткую і непазбежную перамогу над ворагам. Пра гэта і пра многае іншае расказвалі на ўрачыстым адкрыцці злёту яго ганаровыя госці — ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Асабліва запомніліся выступленні М. Я. Баранава, былога камандзіра партызанскай брыгады імя Ракасоўскага і В. І. Цімафеевай, удзельніцы вайны, зараз дацэнта кафедры замежнай літаратуры. Жывым водгукам тых дзён і заклікам да сённяшняй моладзі захаваць мір, не дапусціць пажару новай вайны прагучалі іх словы. З вялікай цікавасцю слухалі студэнты расказ Я. А. Рамановскай, пляменніцы паэта, аб гісторыі стварэння музея Янкі Купалы і яго філіялаў у Вязынцы і Ляўках. Удзельнікі злёту перадалі вязынскаму музею кнігі, якія расказваюць аб жыцці і творчасці паэта. Дзве з іх падрыхтаваны да друку супрацоўнікамі філалагічнага факультэта нашага універсітэта.

Злёт працягваўся. Праграма яго была даволі цікавая і разнастайная: тут і бескампрамісная барацьба ў турысцкай эстафеце, і экскурсія ў музей і па купалаўскіх мясцінах, быў час паэзіі, калі юнакі і дзяўчаты ля помніка Янку Купалу чыталі свае вершы. Алег Антонавіч Лойка, які рыхтаваў праграму гэтай паэтычнай гадзіны, звярнуўся затым да слухачоў з прапановай прачытаць свае творы. На жаль, смельчакоў не знайшлося. Але затое потым усе змаглі прадэманстраваць свае здольнасці. Пасля конкурсу на лепшага повара студэнты разбіліся на групы і сабраліся ля вогнішчаў. І тут пад дружны акампанемент лыжак былі выканаты шматлікія песні, што стала добрай прэлюдыяй да канцэрта, у якім прынялі ўдзел два калектывы: студэнцкі фальклорны ансамбль і агітбрыгада атрада «Мара».

А пасля канцэртнай праграмы студэнты адпачывалі і рыхтаваліся да агульнага кастра, якім і закончыўся злёт.

...На алеях адразу стала ціха. Не чутно галасоў і песень. А на душы так хораша і радасна. І няма слоў, якімі можна было б перадаць гэту прыгажосць купалаўскіх вечароў. Перад вачыма цудоўныя паляны кветак, кволыя прыгажуні-бярозкі і магутныя дубы — маленькі куточак нашай Радзімы, апеты ў непаўторных вершах беларускага песняра Янкі Купалы. Пабудзеш тут, і загучаць яго бессмяротныя радкі па-новаму для цябе, у самае сэрца западуць словы, назаўсёды застануцца ў памяці, адгукнуцца шчырай любоўю да Радзімы.

А. ВАЛЬВАЧОЎ.

## АТАКУЕМ ФАРМАЛІЗМ

# ШЭФСТВА... НАД ПАПЕРАМІ

ВЕДАЕЦЕ такую песню: «Найцудоўнейшы важаты ёсць, сябры, у нас»? Так, гэта песня пра самага лепшага, самага вясёлага важатага, які «і на зборы, і ў паходзе, і з усімі ў карагодзе».

Што і казаць, цудоўна, калі сонечным днём у шырока расчыненых дзвярах паяўляецца перад вучнямі гэтакі прыгажун і поўным энтузіязму галасам вымаўляе: «Добры дзень, я ваш важаты. З сённяшняга ранку мы...» О, гэта сапраўды добры дзень! І астатнія словы распачаўшага справу масавіказавадатара тонуць у радасным шуме рознагалосага клічу: «Ур-ра-а!»

Давайце з такімі прыемнымі думкамі накіруемся ва універсітэцкі камітэт камсамола, каб даведацца аб шэфскай рабоце адпаведнага сектара геаграфічнага факультэта. У адрозненне ад мноства іншых педагагічных атрадаў з іншых факультэтаў той, які нас зацікавіў, існуе інкогніта. Або, калі казаць больш зразумела,—без назвы. Але ці варта папракаць сумленных, будзем спадзявацца, шэфаў за такія дробязі, калі, як сведчаць рознакаляровыя папкі справаздач у камітэце камсамола, ім самы час спяваць хвалебныя дыфірамбы. Бо у тых папках ззяюць буйныя літары назваў, спісы мерапрыемстваў і роўныя лініі графікаў, якія сведчаць аб тым, што рабоце педатрадаўцаў няма ні канца, ні краю, педагагічнай выдумцы таксама. Тут і выпуск насценнай газеты «Гаворапь шэфы» (адказныя—камандзір Л. Мальская, камісар М. Бобрык), і работа секцыі «Юны турыст і краязнаўца» (В. Мешчакоў), і фотагуртка (А. Урублеўскі).

У спісе мерапрыемстваў па ідэйна-патрыятычнаму выхаванню чытаем: наведанне музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з пяцікласнікамі, правядзенне палітінфармацый збораў, ранішнікаў, лекцый. А конкурсы, віктарыны! Словам, было ад чаго ўзрадавацца. І як тут было не накіравацца з жаданнем пачуць словы ўдзячнасці ў сярэднюю школу № 1, што з'яўляецца падшэфнай педатрада.

Але жаданні часам пераркрэсліваюцца жорсткай рукой рэальнасці. Як гаворыць народная мудрасць: не усё тое золата, што блішчыць. Дастаткова было толькі пагутарыць з настаўнікамі і вучнямі падшэфнай школы.

Надзея Аляксееўна Шпак, адказная за арганізацыйную работу ў школе, даведаўшыся пра мэту майго прыходу, шчыра здзівілася:

— Шэфы? З БДУ? Прабачце, але ў нас працуюць шэфы з інстытута культуры.

Заўважыўшы недаверлівы позірк, Надзея Аляксееўна пачала гартаць блакнот. Нарэшце твар яе праясніўся:

— Нешта прыпамінаю. Прыходзілі ў пачатку года некалькі чалавек. А больш я іх не бачыла.

Што гэта, непаразуменне?

Звернемся да класнага кіраўніка 7-га «Г» класа З. А. Смольскай. У гэтым класе павінен працаваць фотагуртюк пад кіраўніцтвам А. Урублеўскага. Ён жа і «шэф» гэтага класа.

У адказ на пытанне—выразны позірк:

— Ніхто не прыходзіў. Упершыню чую. Тое, што гурток павінен працаваць у нашай школе, дык гэтага я зусім не ведаю. У Дом піянераў ходзяць нашы вучні. Вы, магчыма, нешта пераблыталі.

— ???

Будзем лічыць, што гэтыя пытанні адрасаваны вам, шаноўныя педатрадаўцы.

Звінелі дзіцячыя галасы ў калідоры. А ў вушах — развітальныя словы завуча: «Сорамна, паважаныя студэнты. Самі ж будучыя педагогі, а адказнасці за сваю работу — ніякай».

І сапраўды, хіба не сорамна?

Ці варта расказваць, як сустрэлі аўтара гэтых радкоў кіраўнікі педагагічнага сектара камітэта камсамола геаграфічнага факультэта. Не, яны не засароміліся. Ад «шэфаў» раптоўна пасыпаўся такі паток інфармацыі аб мерапрыемствах, што немагчыма было ўставіць нават слова насуперак. Толькі ў адным месцы камандзір неяк збілася: «Газета? Газета, ведаеце, не выйшла...».

На прапанову паразмаўляць з астатнімі членамі атрада «кіраўніцтва» адгукнулася так: паловы з іх няма на занятках, а другая палова—першакурснікі, а яны, маўляў, не маюць вопыту. Які вопыт мела на ўвазе Л. Мальская? Калі такі, якім карыстаюцца зараз, то яго бадай што не мае сэнсу набываць. І яшчэ. Каму патрэбны гэткія «справаздачы» аб шэфстве над паперамі?

**Н. ЖАРКЕВІЧ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

## СТУДЭНТ І НАВУКА

# НА КАРЫСЦЬ СПРАВЕ

РОЛЮ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ работы студэнтаў у падрыхтоўцы кадраў высокай кваліфікацыі цяжка пераацаніць. Заняткі «вялікай» навукай аказваюць добры ўплыў на студэнтаў. Гэта дае магчымасць кожнаму з іх адчуць радасць адкрыцця новага, радасць творчасці і разумення важнасці асабістай працы. У нашым універсітэце пастаянна вядзецца планамерная і мэтанакіраваная работа па прыцягненню студэнтаў да навуковых даследаванняў. Разам з тым, пытанні паляпшэння арганізацыі дзейнасці студэнцкіх навуковых саветаў з'яўляюцца надзённымі. У гэтай сувязі навуковым студэнцкім саветам (НСС) універсітэта быў арганізаваны і праведзены семінар па абагульненню і абмену вопытам работы факультэцкіх НСС і студэнцкіх навуковых гурткоў па ўсіх напрамках дзейнасці іх сектараў. У рабоце семінара прынялі ўдзел кіраўнікі і старасты гурткоў, актыў навуковых студэнцкіх саветаў. Быў запрошаны адзін са старэйшых прафесараў універсітэта І. Р. Некрашэвіч. У сваім выступленні ён расказаў аб арганізацыі НДРС ва універсітэце, падзяліўся вопытам выкарыстання розных форм работы, выказаў пажаданне яшчэ больш актыўна садзейнічаць прыцягненню студэнтаў да НДР, улічваючы спецыфіку прыродазнаўчых і гуманітарных факультэтаў.

Цікавым і змястоўным было паведамленне кіраўніка гуртка замежнай літаратуры Т. В. Кавалёвай. Яна расказала аб мерапрыемствах, якія праводзяцца актывам гуртка, выказала думку аб неабходнасці шырокага ўдзелу студэнтаў у конкурсах і канферэнцыях іншых ВНУ краіны. Аб сваіх поспехах і праблемах у навуковай рабоце расказалі старасты гурткоў неарганічнай хіміі А. Селянінаў, гісторыі БССР А. Каханоўскі, агульнага землязнаўства Н. Гучок і іншыя. У выступленнях шмат увагі ўдзялялася пытанню, як зрабіць навуковую дзейнасць членаў гурткоў больш цікавай і разам з тым унесці свой уклад у рашэнне задач народнай гаспадаркі, навукі і тэхнікі. З вялікай увагай было выслухана паведамленне асістэнта кафедры агульнага праграміравання П. П. Кожыча — кіраўніка секцыі навукі пры клубе навукі і мастацтва «Красавік», што створаны на ФПМ. Ён расказаў аб вопыце арганізацыі студэнцкіх навуковых атрадаў.

З заключным словам выступіў намеснік старшыні савета па НДРС БДУ імя У. І. Леніна А. Ф. Нікіценка.

Сяброўская атмасфера, зацікаўленасць прысутных абмяркоўваемым пытаннем садзейнічалі ўсебаковаму, дзелавому абмену думкамі. Ва ўсіх выступленнях прапаноўвалася ідэя больш шырокага прыцягнення да навуковай работы студэнтаў малодшых курсаў. Навуковаму студэнцкаму савету універсітэта было рэкамендавана выступіць перад саветам па НДРС і рэктаратам з прапановамі па пытанню аб расшырэнні магчымасці камандзіравання студэнтаў на міжвузаўскія семінары і канферэнцыі, аб выпуску аднаго-двух нумароў у год універсітэцкага зборніка лепшых навуковых студэнцкіх работ, аб стварэнні матэрыяльнай базы студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый і гурткоў, аб выдзяленні машыннага часу на ВЦ універсітэта студэнцкім навуковым гурткам і атрадам.

**А. ГОПКА,**
**інструктар камітэта камсамола універсітэта.**

## ФОТАРЭПАРТАЖ

# ДАВАЙ ЗНАЁМІЦЦА, ТАВАРЫШ

**— Паедзеш!**
**— Я сказаў, не. Колькі разоў можна паўтараць.**
**— Потым шкадаваць будзеш.**
**— Хто, я. Ніколечкі. Хіба вы можаце прапанаваць мне штонебудзь лепшае, чым бераг мора, яркае сонца...**

(З размовы)

**— Ірка, ты летам куды едзеш?**
**— У будатрад.**
**— У «Стэлуцу»?**
**— Так.**
**— Ой, Ірка, і шчаслівая ж ты! Які ў вас цудоўны атрад. Я ўжо шмат чула пра яго. Вазьміце мяне з сабой. А?..**

(З размовы)

Гэтыя дзве размовы адбываліся ў сакавіку, тады, калі ва універсітэце пачалі фарміравацца студэнцкія будаўнічыя атрады. А каб у нядзелю, 20 мая, галоўны герой першай размовы пабываў на стадыёне ў Шчамысліцы, то сустрэў бы тут і Іру з сяброўкай, і ўбачыў бы шмат юнакоў і дзяўчат, апранутых у зялёную форму з ганаровымі эмблемамі. Студэнцкія будаўнічыя атрады — пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва універсітэта ў падрыхтоўчы перыяд сабраліся на VI традыцыйны злёт.

Ад імя рэктарата, парткома злёт вітае сакратар партыйнага камітэта універсітэта М. І. Дзямчук. Права на падняцце сцяга злёту прадастаўляецца лепшым з лепшых — прадстаўнікам атрадаў імя Машэрава (юрфак) і «Верасы» (хімфак).

Злёт адкрыты. Юнакі і дзяўчаты разыходзяцца па спартыўных пляцоўках, каб тут ва ўпартай барацьбе вызначыць самых спрытных, самых моцных.



### ВОСТРЫ ВУГАЛ АТАКІ

— ВЕДАЕЦЕ, а ў саставу каманды «Аэліта» факультэта радыёфізікі і электронікі ўваходзяць амаль што ўсе члены зборнай каманды факультэта па футболу. У гэтым годзе яны занялі другое месца ва універсітэцкіх спаборніцтвах. «Разнясуць» яны тут усіх.




Так настройвалі на гульню балельшчыкаў байцы атрада «Аэліта». І сапраўды, почырк майстроў адчуваўся ўжо на першых мінутах. Але не спасавала перад моцным супернікам каманда атрада «Мінск-84». Сапраўдны байцоўскі характар праявілі яе футбалісты Г. Ждановіч, У. Аляксейчык, Ц. Шваркоў. І ўсё ж патрэбна прызнаць вопыт і майстэрства «Аэліты». Каманда дабілася перамогі і ў наступных гульнях. У выніку заняла першае месца.

Адначасова з футболам пачаліся спаборніцтвы на валейбольнай пляцоўцы. Тут за права быць першымі змагаліся каманды атрадаў «Аэліта», імя Машэрава, «Верасы», «Мінск-84». Перамогу святкавалі мацнейшыя. Імі зноў сталі байцы «Аэліты».

### АСІЛКІ

ДА ГІРЫ вагой у 32 кг адзін за адным падыходзяць удзельнікі конкурсу на самага дужага байца будатрада.

— І раз, два, тры...

Вельмі ўжо цяжкая яна, гэтая гіра.

— Шаснаццаць... дзевятнаццаць... дваццаць адзін!

Гэта Аляксандр Пінчук, баец атрада «Аэліта». Ён і стаў пераможцам конкурсу асілкаў у вазе звыш 75 кг. У вазе да 75 кг перамог Аляксандр Талкаліца (Атрад «Аэліта»).

● КАНФЕРЭНЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ ●

# НАШ ГОСЦЬ— І. П. ШАМЯКІН

«МІР — ГАЛОЎНАЕ СЛОВА НА СВЕЦЕ!», «Нам патрэбен мір!» — гэтыя думкі ўсё часцей і часцей гучаць у складаных умовах сучаснасці. Свой водгук яны знаходзяць у жывапісе, музыцы, літаратуры і г. д.

Тэме барацьбы за мір прысвечана і адна з апошніх работ народнага пісьменніка Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі, Героя Сацыялістычнай Працы Івана Пятровіча Шамякіна — гістарычны раман «Петраград—Брэст». Па гэтай кнізе праведзена першая ў краіне канферэнцыя чытачоў, студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта.

Старшыня савета ветэранаў універсітэта Іван Васільевіч Марчанка расказаў аб творчасці пісьменніка, якая стала моцнай зброяй у барацьбе за мір і прагрэс.

Аўтар у лаканічных радках прадмовы, прысвечанай друкаванню на старонках газеты «Советская Белоруссия» раздзела з трэцяй часткі рамана «Петраград—Брэст», пісаў: «Вобраз самага вялікага стратэга рэвалюцыі, стваральніка Савецкай дзяржавы Уладзіміра Ільіча Леніна хвалюе кожнага мастака, ці то ён скульптар, жывапісец, рэжысёр, акцёр, пісьменнік... Я асабіста зрабіў першыя спробы напісаць Леніна напярэдадні 100-годдзя з дня нараджэння правадыра. Прыняцце чытачамі апавяданняў «Хлеб», «Матрос з «Алега», аповесцей «Першы генерал», «Эшалон прайшоў» натхніла мяне на больш шырокае палатно». Так з-пад пяра пісьменніка нараджаецца гістарычны раман «Петраград—Брэст».

**— Важнай стылёвай рысай рамана,—сказала студэнтка 2-га курса механіка-матэматычнага факультэта І. Макарэвіч, — стала філасофскае, праблемнае асэнсаванне суадносін мінулага і сучаснасці. На першых старонках твора звяртаюць на сябе ўвагу такія радкі: «Ах, каб наступіў мір! Каб не халадзелі спіны ад адчування дулаў нямецкіх кулямётаў». Гэта перажыванні і мары не толькі галоўнага героя, гэта і голас самога аўтара, голас усіх народаў свету.**

**— Гэта кніга цікавая не толькі як мастацкі твор, але і як багаты зборнік гістарычных дакументаў. Яна мае асаблівае дачыненне да вывучэння гісторыі партыі, — падкрэсліў Герой Савецкага Саюза прафесар Д. П. Жмуроўскі.**

**— І сапраўды, над гэтай кніжкай мне давялося доўга і настойліва працаваць, — успамінае І. П. Шамякін. — Збіраў патрэбны матэрыял у архівах, старанна вывучаў творы У. І. Леніна. Даведаўся шмат новага і цікавага. Усё гэта і лягло ў аснову кнігі. Чаму твор паявіўся іменна ў гэты час! Таму што сёння вельмі важна ведаць аб вытоках міралюбівай палітыкі Савецкай дзяржавы.**

**— Раман «Петраград—Брэст» звязаны з вялікай думкай — думкай аб міры,— сказала ў заключэнне загадчыца кафедры беларускай літаратуры В. В. Казлова.— Вобраз У. І. Леніна ў ім — новая старонка ў беларускай літаратуры і ў мастацкай літаратуры наогул. Ён знойдзе свайго чытача, бо цікавасць да ленінскай тэмы пастаянна ўзрастае.**

**А. МАТУСЕВІЧ,**
**наш. кар.**

● КУРАТАР І ГРУПА ●

# КАНТАКТ— ТВОРЧЫ

ЗНАЁМСТВА з новым куратарам група чакала з цікавасцю і лёгкім хваляваннем, якое старанна хавалася за крыху ненатуральнай весялосцю. Але раз-пораз у сяброўскай размове чулася чыё-небудзь пытанне: «А які ён, наш новы куратар?» «Вельмі сур'ёзны, патрабавальны да вучобы і дысцыпліны»,— такую характарыстыку пачулі студэнты ад свайго былога куратара.

...Ён хутка і рашуча ўвайшоў у аўдыторыю і адрэкамендаваўся:

— Міхаіл Аляксандравіч Сянюк.

Потым адразу перайшоў да арганізацыйных пытанняў.

«Вельмі малады. Гэта несур'ёзна»,— падумалі дзяўчаты.

«Адразу пра справы загаварыў. Такі паблажкі не дасць»,— вырашыла нешматлікая мужчынская палова.

Як жа складуцца іх адносіны? На «бульбу» 9-я група другога курса педпатока паехала без свайго куратара, якога прызначылі камандзірам іншага атрада. Сустрэліся зноў ужо на занятках. І тады даведаліся студэнты, што атрад Міхаіла Аляксандравіча стаў пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва сярод сельскагаспадарчых атрадаў універсітэта, за выдатную работу ўзнагароджаны Ганаровай граматай. Крыху зайздросцілі другакурснікі тым юнакам і дзяўчатам, а ў душы радаваліся за свайго куратара.

Хутка студэнты 9-й групы пасапраўднаму пасябравалі з Міхаілам Аляксандравічам. Прыцягвала яго дружалюбнасць, справядлівасць, сапраўдная зацікаўленасць іх справамі, жаданне дапамагчы. Спадабалася і тое, што куратар адразу пачаў звяртацца да ўсіх толькі па імёнах.

— З Міхаілам Аляксандравічам прыемна не толькі размаўляць, але і назіраць, як ён гутарыць з іншымі. Заўсёды ветлівы, з прыемнай усмешкай на твары,— гаворыць Наталля Цішчанкова.

— Ніхто ніколі не бачыў яго у дрэнным настроі, не чуў, каб ён павысіў голас ці пакрыўдзіў каго-небудзь. Якія б ні былі ў Міхаіла Аляксандравіча адносіны да студэнтаў, з усімі ён роўны, да ўсіх уважлівы,— дапаўняе сяброўку Аксана Бурак.

Што гэта так, можна меркаваць хаця б па тым, як ахвотна ідуць студэнты на практычныя заняткі па агульнай фізіцы, якія вядзе іх куратар.

— Там заўсёды цікава. Неяк хутчэй і лепш выконваеш работу, калі выкладчык дапамагае не толькі каштоўнай парадай, але і дасціпным жартам.

У групе ў апошні час значна палепшылася паспяховасць.

— Неяк няёмка дзякаваць за душэўнасць і чуласць нашага куратара дрэннымі ведамі,— выказвае думку староста групы Алена Трасцінская.

Студэнты 9-й групы лічаць, што ім з куратарам пашанцавала. Цудоўны выкладчык, сціплы і просты чалавек, цікавы субяседнік. З ім можна паразмаўляць на самыя розныя тэмы, атрымаць адказ на любое пытанне.

— У маёй педагагічнай практыцы гэта ўжо трэцяя па ліку група,— гаворыць М. А. Сянюк. — Тут вучацца вельмі розныя студэнты. Большасць — дзяўчаты. І як куратара мяне вельмі радуе тое, што жывуць студэнты дружна, дапамагаюць адзін аднаму. Галоўнае у іх адносінах — справядлівасць і дабрата.

Па паспяховасці група не вельмі моцная, але большасць выкладчыкаў адзначаюць стараннасць, працавітасць студэнтаў.

Міхаіл Аляксандравіч — пераможца універсітэцкага конкурсу «Лепшы куратар». Яму хочацца як мага больш правесці цікавых і разнастайных мерапрыемстваў, але з-за недахопу часу гэта не заўсёды атрымліваецца. Тады на дапамогу куратару прыходзіць актыў групы.

— Наогул, студэнты вельмі самастойныя, — гаворыць М. А. Сянюк.— Раю іншым пацікавіцца, як патрэбна праводзіць камсамольскія сходы: дзелавыя, дыскусійныя, дзе рашаюцца важныя праблемы, выказваюцца асабістыя думкі і меркаванні.

Душой калектыву з'яўляецца камсорг Ларыса Якавюк. Гэты чалавек на сваім месцы. Сур'ёзная, актыўная, прынцыповая, яна аказвае значны ўплыў на групу.

Я вельмі задаволены работай у падшэфнай школе Гражыны Жукаўскайтэ. Дзякуючы такім людзям, як яна, педатрад фізічнага факультэта займае першае месца ва універсітэце.

Пра кожнага студэнта сваёй групы шмат чаго можа расказаць куратар. А ўсіх іх ён хоча бачыць у будучым адукаванымі спецыялістамі, сапраўднымі педагогамі. Для гэтага ў іх ёсць і здольнасці, і жаданне.

**А. ЯКУБЕЦ,**
**член прэс-цэнтра камітэта камсамола.**

# БУДАТРАД!

## ● І... УЗЯЛІ!

— КАМАНДЫ гатовы? Пачалі.

Канат нейкае імгненне застаецца на месцы. Потым яго сярэдзіна значна пераходзіць на бок каманды з фізфака. Не здаюцца і байцы атрада «Мінск-84», і канат перацягваюць да сябе... Пяць атрадаў адужаў «Мінск-84» і ва ўпартай барацьбе здолеў узняцца на вышэйшую прыступку п'едэстала.

## ● А МЫ ШТО!

ТАДЫ, калі спаборніцтвы сярод мужчынскіх каманд былі ў самым разгары, дзяўчаты вырашылі: а мы што, горшыя? І запатрабавалі ў суддзяў распачаць спаборніцтвы па... футболу. Вось было дзіва для моцнай паловы: дзяўчаты і футбол. А як вы думалі? Яшчэ як умеюць гуляць дзяўчаты з «Мары» і «Верасоў». А вось у «Ветразя» і «Стэлуцы», якія занялі адпаведна першае і другое месцы, нават заўзятым майстрам футбола можна павучыцца.

Дзень прайшоў непрыкметна. Замарыліся ад работы суддзі. Ім, акрамя правядзення ўсіх спаборніцтваў, яшчэ патрэбна было падвесці вынікі і па афармленню атрадамі лагераў, і конкурсу насценных газет... Стаміліся і балельшчыкі. Усюды трэба было паспець, паглядзець, падбадзёрыць сваіх сяброў. А колькі было крытычных момантаў у іх каманд! Колькі давялося пахвалявацца. Але ўсё роўна чагосьці не хапае. Песні! Так, звонкай студэнцкай песні. І загучалі ў вячэрнім паветры студэнцкія галасы. Выступаюць агітбрыгады атрадаў «Ветразь», «Стэлуца», «Аэліта», імя Машэрава, імя Скарыны, імя Лілі Карастаянавай, «Мінск-84», «Мара», «Верасы»...

Заключнае пастраенне ўдзельнікаў злёту. Падвядзенне вынікаў. Узнагароджанне пераможцаў. Аб чым думаюць у гэтыя мінуты байцы? Аб сваёй асабістай перамозе або перамозе сваёй каманды? Напэўна, і аб гэтым. І яшчэ аб тым, як хутка прайшоў дзень, як хутка праходзіць час, студэнцкія гады. І як цудоўна, калі побач з табой твае сябры. Як цудоўна, што ёсць студэнцкія будаўнічыя атрады, дзе справа знойдзецца кожнаму!

**А. АНАТОЛЬЕВА,**
**баец атрада «Мінск-84».**
**Фота Г. ТРАЦЦЯК.**



● СУСТРЭЧЫ ДЛЯ ВАС ●



*Перапоўненую залу зноў і зноў узрывалі апладысменты... Малай-цы! Ма-лай-цы!*

*Зноў і зноў на сцэну ішлі запіскі з пытаннямі: як вы ствараеце свае песні, калі і як пазнаёміліся, чым захапляецеся?..*

*І абавязкова прасілі спяваць. Зноў і зноў.*

*І зноў Таццяна падыходзіла да мікрафона. Сяргей займаў месца побач, кранаў струны гітары, і магутныя дынамікі неслі ў залу песню.*

*Канцэрт Нікіціных працягваўся... Працягваўся ўсе тры гадзіны. Тым, хто сядзеў у першых радах, было бачна, як часам нялёгка даваўся той ці іншы складаны куплет спевакам. Але Сяргей і Таццяна трымаліся малайцамі.*

*— Дзякуй, шчырае вам дзякуй, маскоўскія госці! За вашы мудрыя песні, за талент, за шчодрасць душы,— словамі намесніка сакратара камітэта камсамола хочацца адказаць на выступленне гэтых майстроў самадзейнай песні ў БДУ імя У. І. Леніна.*



**● Агітпаход газеты «Беларускі універсітэт», прысвечаны 40-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў**

# АСВЕЯ: СЦЕЖКАМІ БОЛЮ

**У год юбілейнай даты вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў па месцах былых баёў, партызанскімі сцяжынкамі пройдуць студэнты ўсіх навучальных устаноў нашай рэспублікі. Адзін з такіх зорных паходаў быў арганізаваны рэдакцыяй газеты «Беларускі універсітэт».**



...Камфартабельны «Ікарус», што яшчэ на самым золку выехаў з Мінскага аўтавакзала «Усходні» ў напрамку на Верхнядзвінск, пераадолеў ужо значную частку дарогі. За вокнамі — полацкая зямля. Рунеюць палі. Іх раз-пораз змяняюць сасновыя бары і бярозавыя пералескі. Мільгаюць невялікія, але жвавыя рачулкі...

У састаў групы ўвайшлі ў асноўным студэнты факультэта журналістыкі на чале з камандзірам Сяргеем Плыткевічам: Алена Гойтан, Наталля Курбацкая, Анжэла Каранік, Ігар Ляўшын, Ірына Капусціна і аўтар гэтых радкоў. Яшчэ два хлопцы—Андрэй Сакалоўскі і Алег Раманчык — выхаванцы хімічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў.

**Верхнядзвінскі раён. Адна з адметных мясцін — Курган Дружбы ля вёскі Прошкі, там, дзе сыходзяцца межы трох братніх рэспублік: РСФСР, Латвіі і Беларусі.**

Курган Дружбы. Іменна да яго і скіраваны наш шлях. Але спачатку нам патрэбна прайсці амаль палову былога Асвейскага раёна, завітаць у Латвію, а там ужо выйсці на Пскоўшчыну.

**Вайна падбіралася да гэтага блакітнаазёрнага краю нядоўга. Ужо 6 ліпеня запыленая фашысцкая салдатня рагатала, абмываючыся на беразе Асвейскага возера. Над будынкам раённага Савета ў Асвеі да вечара быў замацаваны гітлераўскі штандар і на ганку прыладжаны партрэт «усемагутнага» фюрэра. Партрэт, праўда, праз тры тыдні збілі са сцяны і пашкамяталі мясцовыя падлеткі, але фашысты засталіся, і надоўга. На тры жудасныя гады.**

**З першых жа дзён гітлераўцы ўсталявалі ў раёне жорсткі акупацыйны рэжым. Свой крывавы «новы парадак» фашысцкія варвары ўсталёўвалі масавым тэрорам, катаваннямі і шыбеніцамі, жудаснымі здзекамі над жанчынамі, дзецьмі і старымі.**



**Асвейская трагедыя... Гэта здарылася ў сакавіку 1943 года. На працягу некалькіх дзён у раёне лютавалі фашысцкія карнікі. Яны зруйнавалі 158 населеных пунктаў. Не стала райцэнтра Асвеі, мястэчка Каханавічы. З людаедскай бязлітаснасцю гітлераўцы спалілі жывымі і ўтапілі ў рацэ Свольна 3.639 мірных савецкіх жыхароў. Сярод іх 2.118 дзяцей да дванаццацігадовага ўзросту. Карнікі вывезлі ў нямеччыну 2.615 мужчын і жанчын, забралі іх маёмасць, хлеб, жывёлу...**

**Той, хто быў у Хатыні, не мог не звярнуць увагу на могілкі спаленых вёсак. Ёсць там і такія назвы: Горлавічы, Валацні, Вялікая і Малая Рудня, Гаравое, Нечарцы, Халадніні, Заазер'е, Ветцы — вёскі-нябожчыкі Верхнядзвінскага раёна, праз якія пралягаў шлях нашага паходу.**

Разам з Сяргеем Плыткевічам мы ідзём ад Асвейскага возера. Азіраюся — нябесны блакіт ля самага гарызонту зліваецца з блакітам асвейскай вады. Ля берагу мітусяцца і, шалёна гарланячы, спрачаюцца паміж сабой белакрылыя чайкі. Высокае майскае сонца быццам спяшаецца за адзін дзень насыціць веснавую зямлю сваёй цеплынёй. Сады пaабапал дарогі, якой мы падымаемся ўгору, ужо кранула першая квецень. І ад усяго гэтага — і ад зеляніны прыазёрных мурагоў, і ад духмянай чаромхі, і ад пяшчотнага ветрыку, што часам налятае з возера, і ад пачуцця бяскрайняй прасторы раптам пачынае кружыцца галава. Хочацца тут жа прылегчы на абуджаную сонцам зямлю тварам да неба і бясконца глядзець і глядзець у яго прыцягальную далячынь.

...Сустрэча з Вольгай Мікалаеўнай Шарко, былой медсястрой партызанскай брыгады імя М. Фрунзе, адбылася зусім неспадзявана ў кабінеце сакратара гарадскога выканаўчага камітэта Савета народных дэпутатаў г. п. Асвея. Сюды мы завіталі, разлічваючы атрымаць неабходную інфармацыю: імёны і месца жыхарства былых партызан, сведкаў ваеннага ліхалецця, каб потым наведаць іх. Акрамя адрасоў і імёнаў, мы, што называецца, з першых рук даведаліся аб тым, як была створана і дзейнічала першая на Асвейшчыне падпольная арганізацыя, кіраўніком якой быў Уладзімір Сімацкі.

**Асвейшчына — невялічкая частка Беларусі, частка рэспублікі-партызанкі. Барацьба пачыналася з падполля. У Асвеі яно згрупавалася вакол камуніста, былога камандзіра Чырвонай Арміі, а да вайны — начальніка райфа Уладзіміра Сімацкага. Са жніўня 1941 года ён узначаліў дзейнасць невялікай групы. У яе ўваходзілі Антон Літвінаў і яго жонка Ніна, Павел Цалпан і яго жонка Марыя, Уладзімір Падалінскі, Аляксандр Ангудовіч, Людвіг Гяроднік, Мікалай Слічны, Уладзімір Хвежанка. Падпольшчыкі збіралі зброю, слухалі паведамленні ад савецкага Інфармбюро, ад рукі пісалі лістоўкі і распаўсюджвалі іх у пасёлку і навакольных вёсках.**

**«Правай рукой» змагароў у гэты час быў... бургамістр Мікалай Аржанік. Ён ваяваў з немцамі яшчэ ў першую сусветную. Але не доўга. У канцы 1914 года трапіў у палон і змог вызваліцца толькі пасля заканчэння вайны. За час, што знаходзіўся ў Германіі, добра вывучыў нямецкую мову. Таму калі фашыстам на пасаду бургамістра спатрэбіўся чалавек з мясцовага насельніцтва, яны прызначылі Аржаніка. Ад яго падпольшчыкі даведваліся аб намерах гітлераўскага гарнізоннага камандавання. А яшчэ, што было не менш важна, атрымоўвалі звесткі аб тых, каго лічылі сваімі. Вайна — цяжкае выпрабаванне для чалавека, усякае здаралася. Таму перш чым прапанoўваць каму-небудзь работу ў падполлі, яго кандыдатуру абмяркоўвалі і праверялі з «абодвух бакоў». Такая асцярожнасць была не лішняй, тым больш, што ў Асвеі дзейнічаў правакатар.**

**Для сустрэч выкарыстоўвалі хату Уладзіміра Сімацкага, дзе збіраліся нібы на вячоркі. Грала музыка, на стол выстаўляліся адкаркаваныя бутэлькі, час ад часу мужчыны выходзілі на ганак пакурыць, гулялі ў карты... Але гэта быў маскарад. Выставіўшы вартавых-дазорных у два бакі вуліцы, падпольшчыкі абмяркоўвалі, як лепш наладзіць сабатаж, дзе схаваць ад фашыстаў хлеб, жывёлу, чым дапамагчы бежанцам, параненым акружэнцам, якіх у той час было шмат.**

**Прайшло менш паўгода, а асвейскае падполле вырасла ў даволі значную арганізацыю. Да вясны 1942 года яна ўжо налічвала ў сваіх радах каля 200 чалавек.**

**Надыходзіў час адкрыта брацца за зброю. Партызанскія атрады пачалі ствараццa ўжо і за возерам, на самай поўначы Беларусі, і ў суседнім Расонскім раёне, і ў Себежскім, што ў Пскоўскай вобласці. Галоўным месцам дзеяння станавіліся бяскрайнія лясныя гушчары, праселачныя дарогі, пачыналі народныя мсціўцы спрабаваць свае сілы і на чыгунках.**

**Каб засцерагчы ад небяспекі свае сем'і, Уладзімір Сімацкі і Мікалай Аржанік вырашылі арганізаваць сваё «выкраданне» партызанамі. Задумка цалкам удалася. Больш таго, у партызанскай фурманцы яны вывезлі з сабой у лес і нямецкага вартавога.**

**У хуткім часе ўзнік партызанскі атрад, які потым далучыўся да партызанскай брыгады імя М. Фрунзе.**

На самым ускрайку беларускай зямлі, што мяжуе з суседняй Латвіяй, ёсць невялікі раз'езд — Шэшкі. Ад гэтага месца больш за два кіламетры да Кургана Дружбы, ля якога сыходзяцца тры дарогі: ад Шкяўне з боку Латвіі, ад Ляхавіч з РСФСР і ад вёскі Прошкі з Беларусі. Раней тут была вёска. Зараз наўкол толькі шуміць сасновы бор. Вёскі больш няма — пайшла дымам у 1943 годзе разам з людзьмі. Ля самай дарогі ў адным месцы можна бачыць, як маладзенькія хвойкі растуць прама над добра захаваўшымся фундаментам, да якога вядуць чатыры паўзарослыя прыступкі.

**Гэты былы дом быў калісьці нямецкай пагранічнай камендатурай. Акрамя гітлераўцаў, гаспадарамі сябе тут лічылі і латвійскія буржуазныя нацыяналісты — «айсары». Яны ператварылі Шэшкі ў драпежнае гняздо, з якога выязджалі на рабаванне ў беларускія, рускія і латвійскія вёскі. Часам яны пераапраналіся ў ватоўкі, чырвонаармейскія шынялі і наязджалі да вяскоўцаў. Выдаючы сябе за партызан, прасілі хлеба, сала, бульбы... Пасля таго, як жыхары прыносілі ім усё, што толькі было магчыма, яны скідвалі з сябе «партызанскія» ватоўкі і «чырвонаармейскія» шынялі. Пачыналася жорсткая расправа. Білі плёткамі і гумавымі дубінкамі, падвешвалі на крукі за сківіцы і рэбры. Дзяўчат і жанчын мардавалі. Безабаронным людзям выкручвалі рукі і ногі, скручвалі галовы, дзяцей саджалі на калы, скідвалі ў калодзежы...**

**Партызаны асвейскай брыгады вырашылі раз і назаўжды выбіць гітлераўскіх ваяк і іх паслугачоў з Шэшак. Камандаваў атрадам у той аперацыі Уладзімір Сімацкі. На золку народныя мсціўцы абышлі Шэшкі з двух бакоў і раптоўна напалі на фашысцкі гарнізон. Бой быў кароткі, але жорсткі і ўпарты. У хуткім часе гітлераўцы былі разбіты, частка іх уцякла ў суседні гарнізон, у Шкляўне, адкуль іх неўзабаве таксама прагналі. У тым баі ў Шэшках варожая куля абарвала жыццё камандзіра атрада камуніста Сімацкага.**

Расказ аб гэтых падзеях мы пачулі ад жыхаркі Прошак Ефрасінні Мяфодзьеўны Новікавай.

На тым самым месцы, дзе перастала біцца сэрца мужнага партызана-падпольшчыка, зараз устаноўлена мармуровая пліта, на якой выбіты наступныя словы: «17 кастрычніка 1942 года ў баі з фашысцкімі акупантамі загінуў смерцю храбрых слаўны сын беларускага народа, камандзір атрада асвейскай партызанскай брыгады Сімацкі Уладзімір Уладзіміравіч».

Муж Е. М. Новікавай загінуў у далёкай Карэліі. У час, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, на руках Ефрасінні Мяфодзьеўны засталося пяцёра дзяцей. Старэйшай дзяўчынцы было восем, меншаму — два з паловай гады.

Нельга было без болю ў сэрцы слухаць расказ гэтай 87-гадовай жанчыны з жылістымі напрацаванымі рукамі, з глыбокімі ўдовінымі вачыма аб карнай экспедыцыі ў 1943 годзе.

**Партызанскія брыгады вымушаны былі адысці за раку Свольна. Свольна — прыгожая лясная рачулка, што цячэ з Расіі, з возера Нечарыца. Упадаючы ў возера Лісна, набірае сілы і спяшаецца ў Дрысу. Яшчэ і дагэтуль водзяцца на Свольне бабры.**

**У сакавіку 1943 года Свольна, скутая лёдам, выйшла з берагоў. Рака была запруджана трупамі.**

**Карнікі, так і не справіўшыся з партызанамі, нішчылі мірнае насельніцтва. Хто не паспеў схавацца ў лесе, быў забіты. Каго знаходзілі, таксама заганялі ў хаты і палілі жывымі.**

**У вёсцы Ардаўскія карнікі сагналі ў хлявы 150 чалавек. Многім пазабівалі ў грудзі цвікі. Потым усіх спалілі. У Задзежжы загінула ў полымі 250 жыхароў.**

**20-кіламетровы партызанскі фронт на Свольне карнікі прарваць не здолелі. За месяц баёў гітлераўцы страцілі шмат жывой сілы і тэхнікі. 13 сакавіка, апоўначы, партызаны нанеслі ім нечаканы контрудар, настолькі адчувальны, што гітлераўцы запатрабавалі падмацаванне. Апраўдваліся, быццам у раён прыбылі новыя партызанскія атрады і скінуты дэсант Савецкай Арміі. Брахня не дапамагла, падмацавання не далі — дзе яго ўзяць, калі перад гэтым было разбіта войска Паўлюса і паспяхова развівалася наступленне Савецкай Арміі.**

**Пад ударамі партызан карнікі пакаціліся назад. Пасля 40 дзён няспынных баёў Асвейскі раён зноў быў ачышчаны ад акупантаў.**

Сёння на месцах былых баёў, на рубяжах, дзе прынялі смерць за свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы лепшыя сыны і дочкі, узвышаюцца манументы-помнікі

Уладзіміру Іосіфавічу Вестынбергу.

Георгію Сяргеевічу Лукашонку.

Алене Паўлаўне Сураўнёвай.

Сотням, тысячам іншых... Хто сваю кроў, жыццё ахвяраваў справе перамогі над ворагам.

**НА ЗДЫМКАХ: пра былыя дні расказвае Е. М. Новікава; у час кароткага прывалу на беразе ляснога возера Вялікі Зелянец; пераправа.**

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
наш кар.

Фота **С.** Плыткевіча.



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

24 мая 1984 г.

АТ 10252 Зак. 881.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ